**2025 г. - - 120 гадоў з часу першага згадвання пра школу ў вёсцы Імянін Кобрынскага раёна (дзяржаўная ўстанова адукацыі «Імянінская сярэдняя школа»; 1905)**



Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Імянінская сярэдняя школа» (в. Імянін, вул. Школьная, д. 49) - адна з найстарэйшых школ Кобрынскага раёна. Упершыню згадваецца ў Памятнай кніжцы Гродзенскага епархіяльнага вучылішчнага савета ў 1905 годзе. Гэта была аднакласная царкоўна-прыхадская школа, дзе навучалася 37 хлопчыкаў і 12 дзяўчынак. Загадчыкам школы і законанастаўнікам быў святар Аляксандр Паўлавіч Вятчанінаў.

Да 1939 года навучанне ў школе вялося на польскай мове. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў школе было чатыры класы і два настаўнікі. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны школу зачынілі, у 1944 годзе яна была спалена. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў заняткі праходзілі ў дамах мясцовых жыхароў Парфёна Мароза, Казіміра Крыжаноўскага, Спірыдона Вакулюка.

У 1947 годзе пабудаваны новы будынак школы. У 1949 годзе школа атрымлівае статус сямігадовай, з кожным годам прырастае новымі вучнямі і настаўнікамі пад кіраўніцтвам дырэктараў Мікалая Цімафеевіча Сігаева (1951-1953), Івана Іванавіча Пракапука (1953-1959), Пятра Грыцука і Крывашэева (перыяд з 1959-га па 1961).

У 1962 годзе кіраўніком установы быў прызначаны Пётр Еўстафьевіч Дашчук, з імем якога звязана буйнамаштабная мадэрнізацыя ўстановы. У рэжыме вялікага будаўніцтва Імянінская школа жыла шмат гадоў, з кожным годам зменьваючыся і прырастаючы новымі пабудовамі. 26 ліпеня 1964 года пачата будаўніцтва дадатковых чатырох класных пакояў. У 1968 годзе разабралі старую школу, на яе месцы пабудавалі майстэрні. З часам з'явіліся асобныя будынкі для шасцігодак і навучэнцаў старэйшых класаў. Калі колькасць вучняў дасягнул 180-ці, быў пабудавана новы будынак для пачатковых класаў.

У 1977 годзе дабудавалі некалькі новых класаў і заклалі спартыўную залу. На тэрыторыі школы размясціўся вялікі сад, яго пладамі дзеці маглі ласавацца на працягу ўсяго

навучальнага года. Была пабудавана кацельня. Прышкольны эксперыментальна-доследны ўчастак здзіўляў экзатычнымі раслінамі. Клумбам на школьным двары не было роўных у раёне. Невыпадкова, што ў 1980-х гадах школа, якая мела такую добрую адукацыйную базу, была запрошана ў якасці ўдзельніка на ВДНГ СССР.

У 1989 годзе Імянінская школа стала сярэдняй. З новабудоўляў з'явіліся бібліятэка і камп'ютарны клас, што дазволіла невялікай вясковай школе ісці ў нагу з часам і зрабіла яе прывабнай для школьнікаў з бліжэйшых населеных пунктаў і нават з горада. У 1997 годзе школу ўзначаліў Уладзімір Рыгоравіч Луцэнка, у 2004 годзе абавязкі дырэктара былі ўскладзены на Наталлю Сямёнаўну Панасюк.

З 30 жніўня 2008 года працуе школьны гісторыка-краязнаўчы музей «Імяніначка», які размешчаны ў адным з будынкаў школы і прадстаўляе сабой выяву старажытнай вясковай хаты. З усіх куткоў вёскі былі сабраны экспанаты для экспазіцыі: прылады працы, прыстасаванні, вялікая калекцыя ручнікоў. Колькасць экспанатаў - 322, у т. л. асноўнага фонду – 275. Арганізаваны два раздзелы экспазіцыі: «Беларусь сёння» і «Гісторыя Імянінскай сярэдняй школы». У 2013 годзе ў школе зроблены рамонт, дабудаваны тры новыя кабінеты для пачатковых класаў з пераходам, які злучае навучальны корпус са школьнай сталовай.

З верасня 2016 года калектывам, у якім працуюць 29 педагогаў і навучаецца 165 вучняў, кіруе Марына Рыгораўна Юрэня. У школе дзейнічаюць дзве групы падоўжанага дня. Пасля ўрокаў вучні могуць паглыбіць веды па вучэбных прадметах на факультатыўных занятках або прысвяціць некалькі гадзін заняткам па інтарэсах - заняцца спортам, інтэлектуальнымі гульнямі, робататэхнікай. Цяпер для ажыццяўлення вучэбна-выхаваўчага працэсу ў школе ёсць 11 навучальных кабінетаў, асобны кабінет інфарматыкі, спартыўная зала, група прадоўжанага дня, стадыён, бібліятэка, сталовая, кабінет псіхолага.

Імянінская школа стала адной з першых у раёне, дзе была ўкаранёна прафесійная адукацыя: у 10-11 класах юнакі набываюць спецыяльнасць разьбяра па дрэве і бяросце, дзяўчаты - швачкі.  У рамках дабрачыннага праекта ААТ «ААБ Беларусбанк» «У школу з Беларусбанкам» ДУА «Імянінская сярэдняя школа» першай у Брэсцкай вобласці атрымала новы аўтобус (2013). У 2023 годзе школа стала першай у Брэсцкай

вобласці, дзе рэалізуецца праект «Кібербяспека дзецям». Вучні школы становяцца пераможцамі конкурсаў, навуковых канферэнцый, прадметных алімпіяд.

За гады сваёй дзейнасці Імянінская школа дала пуцёўку ў жыццё больш за 1000 выпускнікам, сярод якіх ёсць грамадскія дзеячы, вучоныя, урачы, інжынеры, святары. У в. Імянін нарадзіўся Уладзіслаў Паўлавіч Падпалаў, беларускі вучоны ў вобласці клінічнай медыцыны, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук, прафесар.

На будынку школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка Барысу Мікалаевічу Сурыну, першаму камандзіру 123-га знішчальнага авіяпалка ў Кобрыне, які загінуў у баі 22 чэрвеня 1941 года.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Дзяржаўнай** установе адукацыі «Імянінская сярэдняя школа» (1905) – 120 гадоў // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. – С. 194.

**Летапіс** роднай старонкі : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 500-годдзя з часу першага ўпамінання в. Імянін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Т. М. Баранская. – Кобрын, 2019. – 40 с : фат. - (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

**Андросова, О.** Почему пост — не диета / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. - 2025. — 22 лютага (№ 8). — С. 7 : фот.

Перед учащимися Именинской средней школы выступил настоятель храма деревни Береза Кобринского района отец Александр.

**Белов, Д.** Посетили мемориал "Остров Мужества и Скорби" / Дмитрий Белов ; фото из архива Именинской средней школы // Кобрынскі веснік. - 2025. — 1 сакавіка (№ 9). — С. 7.

Учащиеся Именинской средней школы Кобринского района и руководители по военно-патриотическому воспитанию приняли участие в торжественном митинге по случаю Дня памяти воинов-интернационалистов, который прошел на острове Мужества и Скорби в городе Минске.

**Белов, Д.** Награда лидеру / Дмитрий Белов, Жанна Елизарова ; фото из архива Тамары Цапко // Кобрынскі веснік. - 2024. — 21 верасня (№ 38). — С. 7 : фот.

Председатель первичной профсоюзной организации Именинской средней школы Тамара Цапко отмечена Благодарностью Брестской областной организации профсоюза работников образования и науки.

**Бакун, Е.** О кибербезопасности детям / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 25 лістапада (№ 69). — С. 15 : фот.

Именинская СШ стала первой в Брестской области, где реализуется проект "Кибербезопасность детям".

**Бакун, Е.** С заботой о детях / Елена Бакун ; фото из архива Именинской СШ // Кобрынскі веснік. - 2023. — 11 лістапада (№ 67). — С. 8 : фот.

В рамках благотворительного проекта ОАО "АСБ Беларусбанк" "В школу с Беларусбанком" ГУО "Именинская СШ" первой в Брестской области получила новый автобус.

**Елизарова, Ж.** Будущее уже сегодня / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 25 студзеня (№ 6). — С. 1 : фот.

В ГУО "Именинская средняя школа" углубленно развивают интерес школьников к научно-техническому творчеству.

**Елизарова, Ж.** С днем рождения, школа! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 30 верасня (№ 76). — С. 4 : фот.

Именинской средней школе исполнилось 115 лет.

**Пальто, К**. На крыльях фантазии / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2018. — 19 мая. — С. 12.

Воспитанники объединения по интересам Именинской СШ — активные участники районных и областных творческих конкурсов.

**Казакова, А.** Отдых с пользой для души / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2017. - 22 июня. - С. 2.

В ГУО «Именинская средняя школа» организован для учащихся палаточный лагерь с круглосуточным пребыванием.

**Кузина, С.** Становление советского школьного образования на Кобринщине / Светлана Кузина // Кобрин-информ. - 2017. — 28 декабря. — С. 6.

**Пашкович, Л.** Прикосновение к живой природе / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2017. — 11 лістапада. — С. 3.

Учащиеся Именинской средней школы на каникулах посетили Кобринский районный эколого-биологический центр.

**Сытин, А.** С пользой для тела и души / Александр Сытин // Кобрынскі веснік. - 2016. — 25 чэрвеня. — С. 9.

Для учащейся молодежи Именинской средней школы работал православный палаточный лагерь.

**Тимошук, А.** Добро, подаренное детям / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2016. — 20 красавіка. — С. 2.

80-летний юбилей отпраздновал П. Дащук, бывший директор Именинской средней школы.

**Бялоў, Д.** Ключ ад каштоўнай скарбонкі / Дзмітрый Бялоў, Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 5 верасня. - С. 1.

Да Дня ведаў - Імянінская сярэдняя школа.

**Магдысюк, С.** Век живи, век учись… / С. Магдысюк // Заря. – 2005. – 18 октября. – С. 3.

К 100-летию Именинской СШ.

**Пятроўская, М**. Юбілей школы / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 1994. – 16 лістапада (№ 90). – С. 3.

90-годдзе адзначыла Імянінская сярэдняя школа.

**Хоміч, В.** Ёсць над чым падумаць / В. Хоміч // Камуністычная праца. – 1978. – 9 лютага.

Працоўнае навучанне ў Імянінскай 8-мі гадовай школе.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Імянін

***Прадметы:***

Школы